УДК 631.115 (476.6)

# ВЕРЦЯЛІШСКАЕ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЕ ТАВАРЫСТВА (1911-1914 ГГ.)

**Радзюк А. Р.**

УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

На пачатку ХХ ст. у Гродзенскай губ. пачынаюць паўставаць сельскагаспадарчыя таварыствы рознага ўзроўню. Першым з іх было губернскае таварыства, якое ўзнікла ў 1901 г. У наступныя гады падобныя арганізацыі, але ўжо павятовага ўзроўню з’явіліся ў Слоніме, Брэсце, Ваўкавыску. Гэта былі аб’яднанні, куды ў асноўным уваходзілі досыць багатыя землеўласнікі. Але ўжо на пачатку другога дзесяцігоддзя ХХ ст. на ўзроўні з памешчыцкімі, на Гродзеншчыне ўзнікаюць сялянскія сельскагаспадарчыя таварыствы. Першая асацыяцыя падобнага тыпу была ўтворана ў вёсцы Верцялішкі.

Ініцыятыва па стварэнні верцялішскага сельскагаспадарчага таварыства зыходзіла «зверху». Вядома, што завадатарам гэтай справы выступіў начальнік Аддзела земляробства і дзяржаўнай маёмасці ў Гродзенскай губ. Ф. Прохараў. Натуральна, што пачын такога высокапастаўленага чыноўніка не мог не прайсці незаўважным. Актыўны ўдзел у рэалізацыі памкненняў начальніка прынялі служачыя меншага рангу, у тым ліку і губернскі ўрадавы аграном Лешчанка. Непасрэдна ў Верцялішках асноўныя абавязкі па рэалізацыі дадзенага праекта былі ўскладзены на мясцовага бацюшку – айца Лявона Тэадаровіча.

На нашу думку, стварэнне сельскагаспадарчага таварыства пры праваслаўным верцялішскім прыходзе было ў першую чаргу абумоўлена жаданнем уладаў супрацьпаставіць яго ўжо існуючым губернскім і павятовым падобным арганізацыям, дзе большасць сябраў складалі каталікі-памешчыкі. Акрамя таго, у Гродзенскай губ. у адрозненні ад многіх рэгіёнаў Расійскай імперыі адсутнічалі земствы, што негатыўна адбівалася на развіцці мясцовай ініцыятывы. Таму менавіта сельскія сельскагаспадарчыя таварыствы, на думку некаторых чыноўнікаў, павінны былі кампенсаваць іх адсутнасць, а таксама стаць правадніком перадавых поглядаў і практык непасрэдна ў вясковым асяроддзі.

Устаноўчы сход верцялішскага сельскагаспадарчага таварыства адбыўся 27 лютага 1911 г. у будынку мясцовай жаночай царкоўна-прыходскай школы. Пасяджэнне вёў губернскі аграном Лешчанка. На



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

ім быў прыняты статут, а ганаровым старшынёй быў абраны Ф. Прохараў. Званні ганаровых сябраў атрымалі некаторыя буйныя (праваслаўныя) землеўладальнікі Гродзенскага павету. Абавязкі ж рэальнага старшыні былі ўскладзены на бацюшку Л. Тэадаровіча. Вядома, што айцец Лявон меў уласную гаспадарку, на якой практыкаваў дзевяціпольны севазварот з выкарыстаннем мінеральных угнаенняў і кармавых траў. Першапачаткова суполка налічвала 60 сябраў, большасць з якіх – мясцовыя сяляне, але былі таксама і асобы «інтэлігентных» прафесій.

У адпаведнасці з статутам арганізацыі асноўнай мэтай яе дзейнасці была папулярызацыя перадавых метадаў вядзення сельскай гаспадаркі сярод мясцовага насельніцтва. Архіўныя матэрыялы дазваляюць вылучыць, якімі спосабамі яна дасягалася. Сярод іх былі экскурсіі ў перадавыя гаспадаркі суседняй губерні, правядзенне лекцый-чытанняў па некаторых агрнамічных праблемах, стварэнне спецыялізаванай бібліятэкі і інш. Але асноўны ўпор усё ж рабіўся на практычны накірунак дзейнасці. У рамках яго рэалізацыі таварыствам былі закуплены перадавыя для таго часу сельскагаспадарчыя машыны і прылады, створаны іх пракатны пункт, ажыццяўлялася закупка новых культур і палепшанага насення старых, уводзіліся новыя віды севазваротаў і ўгнаенняў. Для лепшай візуалізацыі новых метадаў вядзення гаспадаркі было ўтворана паказальнае поле, а таксама запрашаліся спецыялісты (напрыклад, спецыяліст па лугаводству Строганаў жыў у Верцялішках цягам цэлага году).

Першапачаткова таварыства існавала за кошт складак яго непасрэдных сябраў, а таксама субсідый (даволі значных) з боку Дэпартамента земляробства і інш. ведамстваў. Але з цягам часу ў графе «прыход» пачалі з'яўляцца запісы аб паступленні прыбыткаў ад арэнды сельскагаспадарчых машын, племяннога бычка, продажу ўраджая з паказальнага поля і інш. Не ўсе з тых пачынанняў, за якія бралася верцялішская суполка, аказваліся паспяховымі: насенне, якое яны заказвалі часцяком аказвалася сапсутым, некаторыя культуры (турнэпс, напрыклад) не хацелі прыжывацца, вадой залівала паказальнае поле, а ўсё патомства ад племяннога бычка памірала ў першы ж год. Аднак нягледзячы на гэтыя няўдачы, таварыства з надзеяй глядзела ў будучыню, адзначаючы тыя пазітыўныя змены, якія адбываліся як у практыцы вядзення гаспадаркі мясцовых сялян, так і ў іх свядомасці. Але, як вядома, гэтым спадзяванням не было наканавана спраўдзіцца. Распачаўшаяся ў 1914 г Вялікая вайна перакрэсліла іх усе надзеі, ушчэнт зруйнаваўшы тыя парасткі, якія пачалі прабівацца на гэтых землях у папярэднія гады.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

**ЛІТАРАТУРА**

1. НГАБ у Гродне. Ф. 31, воп. 1, спр. 607.
2. НГАБ у Гродне. Ф. 31, воп. 1, спр. 26.

УДК 947.6. «1944-1954»

# ПЕРИОДИЗАЦИЯ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ПОЛЬСКОГО ПОДПОЛЬЯ НА ТЕРРИТОРИИ ЗАПАДНЫХ ОБЛАСТЕЙ БССР В ПОСЛЕВОЕННЫЙ ПЕРИОД (1944-1954 ГГ.)

**Рыбак Н. А.**

УО «Гродненский государственный аграрный университет»
г. Гродно, Республика Беларусь

Польское антисоветское подполье в западных областях БССР в послевоенное время пережило определённую эволюцию, вследствие чего в его истории можно выделить три основных периода.

Первый этап (июнь 1944-январь 1945 г.) хронологически совпадает с освобождением БССР от немецко-фашистских захватчиков, он продолжался до 19 января 1945 г., когда приказом Главного коменданта Армии Крайовой (АК) генерала Л.Окулицкого она была официально распущена. Советское командование одновременно с освобождением западных областей БССР приступило к разоружению и ликвидации польских вооруженных формирований. Уцелевшие после масштабных чекистско-войсковых операций НКВД-НКГБ БССР аковские формирования переживали кадровую неразбериху и деморализацию. В этой ситуации руководство АК приняло решение свести к минимуму вооруженную деятельность своих структур и передислоцировать находящиеся под угрозой разгрома силы за «линию Керзона». Главное командование АК издавало приказы и инструкции о переходе в глубокую конспирацию. Польское подполье не только не собиралось складывать оружие, но и готовилось к продолжительной вооруженной борьбе. На данном этапе его деятельность приобрела отчетливый антисоветский характер, что выразилось в агитационно-пропагандистской работе, диверсиях, а также терактах против советского актива и сотрудников НКВД-НКГБ БССР. В этот период основной формой борьбы с польским подпольем стали чекистско-войсковые операции.

Второй этап (январь1945-сентябрь 1948 г.) характеризуется активной деятельностью крупных постаковских формирований, а также их разгромом. На этом этапе шла очередная реорганизация польского подполья. Возник ряд новых постаковских организаций: АК-АКО, ДСЗ, ВИН и др. Преследуя те же цели, что и АК, но не располагая



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ